Opłatę pocztową uiszczono ryczałtem.

Цана асобнага нумару 20 грош.

# ЖЫЦЬЦЁ БЕЛАРУСА

Выходзіць тры разы ў тыдзень.

Адрэс Рэдакцыі і Адміністрацыі: Вільня, Віленская вул. 12 — 6. (Wilenska 12. m. 6).

Рэдакцыя адчынена ад 12 да 2 гадз. штодня, апрача сьвяточных дзен. Адміністр. ад 9 да 3

Падпіска на адзін месяц з дастаукай да хаты 2 зл. Для заграніцы удвая даражэй.

**Перамена адрэса 30 грошы.**

Няпрынятыя ў друк рукапісы назад не вяртаюцца. Аплата надрукованага залежыць ад Рэдакцыі.

Цана абвестак: перад тэкстам 25 грош., сярод тэксту 20 грош. і на 4 стр. 15 гр., за радок пэтыту ў 1 шп.

№. 17. Вільня, Серада, 4-га лістапада 1925 г. Год I.

## Дзяржавы і народы.

Мы ўжо ня раз адзначалі, што Ліга Народаў—гэта ёсьць саюз зусім *не народаў*, а *дзяржаў*, ды прысвоіла сабе зусім няправільны назоў. Дзяржавы—сябры Лігі — крывадушна гаворыць аб „волі і брацтве народаў“, хаця адначасна самі ўціскаюць захопленыя пад іхнюю ўладу „недзяржаўныя“ нацыі.

Апошнія выпадкі на палітычным небасхіле зьяўляюцца яркім доказам гэтае крывадушнасьці і падвойнае маралі валадароў гэтага сьвету.

Калі на Балканах, здаўна пагражаўшых і пагражаючых сяньня сусьветнаму міру (стуль-ж пачалася і сусьветная вайна!), пачаўся грэцка-баўгарскі канфлікт, ад якога мог-бы перакінуцца ізноў ваенны пажар у Эўропу,—дык Францыя ў асобе Брыяна знайшла спосаб зьліквідаваць гэны канфлікт. Брыян ураз-жа склікаў у Парыж Раду Лігі Народаў, і пад пагрозай апошняе грэцкія войскі былі прымушаны пакінуць сваю безбаронную ахвяру.

Але адначасна з гэтым тая-ж „дэмакратычная і свабодалюбівая“ Францыя ўчыніла рэч, якая на вечныя часы пакрые яе чорнай плямай ганьбы. Іменна, калі ў Дамаску (ў Сірыі) выбухнула паўстаньне тамтэйшага насяленьня проці францускага панаваньня, у часе якога згінула каля ста францускіх жаўнераў, дык „герой“ сусьветнае вайны генарал Сарай загадаў сваей артылерыі *граміць места з гармат, нікога не шкадуючы — ні старых, ні малых*. Францускія газэты пішуць, што пры гэтым згінула каля 2,000 душ пад руінамі збомбардаваных дамоў. Але трэба думаць, што лічба ахвяр францускага „геройства“—значна большая....

Прыпамінаюцца цяпер усе гэныя слушныя закіды немцам, робленыя ім у часе сусьветнае вайны за разгром Лювэну ў Бэльгіі, Каліша ў Польшчы і чысьленых мест і мястэчак у Францыі. Тады Францыя ня мела даволі вострых слоў, каб высказаць сваё абурэньне паступкамі „нямецкіх варвараў“. А цяпер гэтая самая Францыя, якая яшчэ не перастае завочна судзіць гэных „нямецкіх варвараў“, прыгаварываючы іншых з нямецкіх камандзераў на сьмерць, — гэтая самая Францыя выперадзіла тых, каго была выгнала з сям'і культурных народаў....

І ня знойдзецца дзяржавы, якая запратэставала-бы проці агіднага паступку француаў. А Ліга „Народаў“ і ня думае нават зьбірацца ў абароне *народу*, апеку над якім сама-ж яна дала свайму сябру — Францыі.... Бо—справа тут ідзе *іменна аб народ, а не аб дзяржаву*,—аб народ, які ня мае свайго прадстаўніка ў Лізе!

Ніжэй мы падаем падробную справаздачу аб кангрэсе нацыянальных меншасьцяў дзяржаў Эўропы. Як відаць з рэзалюцыяў кангрэсу, аўтары іх спадзяюцца, што Ліга Народаў захоча і здолее разьвязаць проблему нацыянальных меншасьцяў у духу прынятых і абвешчаных самой Лігай і кангрэсам рэзалюцыяў.

Але-ж у Лізе Народаў, да якой звараечацца кангрэс, першую скрыпку іграе—Францыя, тая Францыя, якая справу падлягаючых ёй друзаў у Сірыі разьвязала крывавым загадам генарала Сарайя... Дык трэба быць хіба вельмі ўжо наіўным, каб верыць, што Францыя дапусьце інтэрвэнцыю Лігі ў справы яе калегаў—дзяржаў, якія так сама, як яна, „валадаюць“ жывымі народамі....

Дарэмныя спадзяваньні! Ліга, якая зьяўляецца „акцыйным таварыствам дзяржаў, пануючых над народамі“, ня можа даць волі тым, над кім пануе і.... *хоча далей панаваць*!

## Першы кангрэс нацыянальных меншасьцяў Эўропы у Жэневе.

### Склад кангрэсу.

Як мы паведамлялі, у Жэневе 14 і 15 кастрычніка адбываўся кангрэс прадстаўнікоў „з'арганізаваных нацыянальных меншасьцяў эўрапэйскіх гаспадарстваў. У кангрэсе прынялі ўчасьце: прадстаўнікі **беларускае**, **украінскае** і **літоўскае** нацыянальнасьці з-пад Польшчы, **жыдоўскае**—з-пад Польшчы, Літвы, Латвіі і Чэхаславакіі, **нямецкае**—з-пад Польшчы, Чэхаславакіі, Румыніі, Вэнгрыі, Югаславіі, Латвіі, Італіі, Даніі і Эстоніі, **вэнгерскае** (мадзяраў)—з-пад Чэхаславакіі, Югаславіі і Румыніі, **польскае**—з-пад Нямеччыны, Чэхаславакіі, Латвіі і Літвы, **словенскае** — з-пад Італіі і Аўстрыі, **расейскае**—з-пад Эстоніі, **сэрба-лужыцкае** (вэндаў)—з-пад Нямеччыны, **карпатарусаў**—з-пад Чэхаславакіі, **данскае**—з-пад Нямеччыны і **швэдзкае** — з-пад Эстоніі. Пераважалі сябры парлямантаў пералічаных гаспадарстваў.

### Канфлікт.

На ўступной нарадзе, як мы ўжо пісалі ў папярэднім нумары, выявілася паважнае разыходжаньне паміж прадстаўнікамі **тэрыторыяльных** нацыянальнасьцяў (якія ўваходзяць у склад чужых дзяржаў разам з сваей нацыянальнай тэрыторыяй) і прадстаўнікамі меншасьцяў, **рассеяных на чужой нацыянальнай тэрыторыі**. Гэтак, прадстаўнікі беларусаў, украінцаў і літвіноў з-пад Польшчы дамагаліся пашырэньня праграмы нарад, проці чаго былі прадстаўнікі нетэрыторыяльных нацыянальнасьцяў. Дзеля гэтага прадстаўнікі сказаных нацыянальнасьцяў прымалі ў кангрэсе ўчасьце толькі, як наглядчыкі.

Калі быў адкрыты афіцыяльны кангрэс, дык перад усім адбыліся выбары прэзыдыуму, у склад якога былі выбраны: словенец з Італіі д-р Вільфан (старшыня кангрэсу), адзін немец, адзін паляк, жыд, мадзяр, ды па адным беларус (пас. Ярэміч) і украінец (пас. Васыльчук). Аднак, апошнія два адмовіліся ўвайсьці ў склад прэзыдыуму дзеля вышэйсказанае прычы.

### Прамова пасла Ярэміча.

Ад імя абедзьвюх нацыянальнасьцяў прамовіў **пабеларуску** пас. Ярэміч, які сказаў:

Высокі Кангрэсе!

Мы, прадстаўнікі Беларускага і Украінскага Народу, прыехалі сюды, на гэты вялікі кангрэс, з тэю мэтаю, што тут будзе паложаны першы камень пад фундамант разьвязкі вялікага пытаньня ў Эўропе, гэта — пытаньня аб нацыянальных меншасьцях. Аднак, ініцыятары кангрэсу паднясьлі нам праграму дужа вузкую, бо трактуючую толькі аб культурна-нацыянальнай персанальнай аўтаноміі.

Мы, прадстаўнікі Беларускага і Украінскага народу, сцьвярджаем: што Беларускі і Украінскі народ жыве на сваіх адвечных землях зьбітай масай і становіць ня меншасьць, а большасьць, і што культурна-нацыянальная персанальная аўтаномія здаволіць народу нашага ня можа.

Бяручы гэта пад увагу, мы ўчора ўнясьлі прапазіцыю аб пашырэньні дыскусіі на тэму самаазначэньня народаў, а таксама, каб тут можна было гаварыць аб кожнай нацыі паасобку.

Аднак, на канфэрэнцыі наша прапазіцыя была няпрынята.

Дзеля гэтага, мы ня можам увайсьці ў склад прэзыдыуму, а таксама ня можам браць, як актыўныя прадстаўнікі, удзелу ў нарадах Кангрэсу, і пазастаёмся, як сьведкі, жадаючы Кангрэсу, хоць і ў вузкіх яго рамках, пазытыўнай працы.

Пасьля гэтае прамовы украінскай сэнатаркай Левчанівськай была прачытана ў нямецкай мове дэклярацыя ад імя беларусаў і ўкраінцаў, у якой зьмешчаны высказаныя паслом Ярэмічам думкі.

### Становішча літвіноў.

Прадстаўнік літвіноў з-пад Польшчы, кс. Заёнчкоўскі, зрабіў заяву, у істоце сваей аналягічную з беларуска-ўкраінскай, адзначыўшы таксама, што чыннага ўчасьця ў кангрэсе браць ня будзе і астанецца на ім толькі дзеля інфармацыі.

### Выступленьне палякоў.

Прадстаўнік палякоў з-пад Нямеччыны, граф Сераковскі, запрапанаваў, каб дэклярацыя беларусаў і ўкраінцаў ня была запісана ў пратакол кангрэсу. Выступленьне гэтае выклікала агульнае недаўменьне. Прапазіцыя графа Сераковскага кангрэсам была адкінута.

### Галоўныя рэзалюцыі.

Вось галоўныя рэзалюцыі кангрэсу:

1) Свабода нацыянальнае культуры, як і воля веры, зьяўляецца духовым дабром цывілізованага сьвету. Гэты міжнародавы этычны прынцып мусіць знайсьці сваё выражэньне і зьдзейсьненьне ў позытыўных праўных нормах. У мысьль гэтага кожная дзяржава, у межах якое жывуць другія нацыянальныя групы, мусіць быць абязана забясьпечыць сваім нацыянальным згуртаваньням свабоду культурнага і эканамічнага разьвіцьця, а сябрам іх — неабмяжованае карыстаньне з усіх іх грамадзкіх правоў. Прызнаньне і правядзеньне на дзеле гэтых прынцыпаў прадстаўляе галоўны варунак паразуменьня між народамі і гэтым самым гарантыю міру ў Эўропе.

2) У дзяржавах Эўропы, у межах якіх знаходзяцца другія нацыянальныя групы, кожная нацыянальная група павінна мець права на захаваньне і разьвіцьцё сваей нацыянальнай індывідуальнасьці праз свае арганізацыі, утвораныя на падставе публічнага права, — залежна ад абставінаў, тэрыторыяльна ці пэрсанальна. На пагляд дэлегатаў, гэтае права на аўтаномію прадстаўляе шлях, на якім магчыма лёяльнае супрацоўніцтва без канфліктаў усіх—меншасьцяў і большасьцяў—у сказаных дзяржавах, а такжа паляпшэньне адносінаў паміж народамі Эўропы.

3) У трэцяй рэзалюцыі кангрэс зварачаецца да Лігі Народаў, заяўляючы, што мір у Эўропе магчымы толькі ў прыпадку запраўднае згоды між народамі і вырашэньня нацыянальных проблемаў у дўху вышэйпададзеных рэзалюцыяў.

4) Урэшце, кангрэс высказывае падзяку тым міжнародавым арганізацыям, якія працуюць над разьвязаньнем проблемы аб нацыянальных меншасьцях.

### Скліканьне новага кангрэсу.

Як у нас ужо пісалася, кангрэс даручыў свайму прэзыдыуму склікаць новы кангрэс нацыянальных меншасьцяў Эўропы. Пры гэтым пастаноўлена, што, хаця беларусы і ўкраінцы адмовіліся ўвайсьці ў склад прэзыдыуму, якому кангрэс пасьля даручыў падгатаваць скліканьне новага кангрэсу, аднак, каб гэтыя дзьве нацыянальнасьці маглі ў ім прыняць чыннае ўчасьце, мейсцы іх у прэзыдыуме захоўваюцца, і яны здолеюць пашырыць праграму кангрэсу ў пажаданым для іх кірунку.

## Сойм.

### З вастрожнае камісіі Сойму.

На паседжаньні вастрожнае камісіі 29 кастрычніка дэп. Ярэміч запрапанаваў прыняць гэткую рэзалюцыю:

„Камісія прыйшла да пераканаўня, што ў паліцэйска-сьледчых арыштах пануе сыстэма біцьця дзеля вырываньня паказаньняў, а такжа нялюдзкага катаваньня і агіднага зьдзеку. Здараюцца выпадкі забойстваў“.

Рэзалюцыя, падтрыманая прадстаўнікамі пэпээсаў і жыдоў, была, аднак, адкінута правіцовай большасьцяй на чале з... панам Тугуттам! Дэп. Ярэміч падаў свой асобны пагляд (votum separatum).

### ІНТЭРПЭЛЯЦЫЯ

паслоў з Беларускае Сялянска-Работніцкае Грамады і тав. да п. міністра ўнутраных спраў у справе **пагвалчэньня недатыкальнасьці пасольскае кватэры дзяржаўнай паліцыяй у Саколцы.**

Гвалчэньне пасольскае недатыкальнасьці дэпутатаў, якія належаць да партыяў, што шчыра стаяць на клясавым сялянска-работніцкім груньце і нядвузначна выяўляюць свае опозіцыйныя адносіны да абшарніцка-буржуазнага ўраду,—сталася ў „дэмакратычнай“ і аба-

## Наднёманская канфэрэнцыя.

„Rigos Siwas“ піша, Аляксандровы, прадстаўнік ССРР у Коўне, стараецца даведацца, ці ня згодзіцца Літва прыняць учасьце ў канфэрэнцыі ССРР, Польшчы й Літвы аб сплаве па Нёмне, параходзтве па ім, а таксама аб транзіце чыгункамі. У апошнім выпадку ў канфэрэнцыі можа прыняць учасьце й Латвія.

Кам. Аляксандровы паведаміў, што тых трактатаў, якія заключаны бяз згоды ССРР, Рады ня прызнаюць.

## Рады канцэнтруюць войскі на граніцы (?)

„Słowo“ наказуе, што з Менску пішуць, быццам Радавая Улада канцэнтруець войскі на паўночнай граніцы Польшчы і Латвіі.

## Навыя манэўры радавага флёту на Балтыцкім моры.

З Рэвля пішуць, што 26/X на ўзьбярэжжы Эстоніі распачаліся новыя манэўры радавага балтыцкага флёту, сярод якога заўважаны мінаносцы.

## Замах на Чычэрына.

Савецкая прэса піша, што Чычэрын, будучы заграніцай, атрымаў некалькі пісьмаў з „сьмяротнымі прыгаворамі“ ад процібальшавіцкай эміграцыі. Адзін з замахоўцаў быццам быў арыштаваны паліцыяй у Варшаве.

## Зблiжэньне паміж Югаславіяй і ССРР.

Югаславія, якая ца гэтага часу была гняздом расейскай чорнасоценскай эміграцыі, варожай да бальшавікоў, у апошні час зьмяніла сваю тактыку. У найбліжэйшым часе дыплёматы абедзьвюх дзяржаў маюць зьехацца на канфэрэнцыю.

Гэта мае зыйсьціся з прыездам Чычэрына ў Вену, дзе ён будзе мець нараду з прадстаўніком Радаў у Югаславіі.

## Рэзультаты выбараў у Клайпэдзе.

Пры выбарах у Клайпэдзкі Сойм (у Літве) немцы атрымалі 58.067 галасоў, Літвіны—2.998 і камуністы—1.326. Такім чынам выбралі 28 немцаў і аднаго літвіна.

## Урадавы крызіс у Нямеччыне.

Нямецкія нацыяналісты нездаволены „ўступкамі“ Лютэра і Штрэзэмана ў Лёкарно і ня толькі заявілі, што рашуча адкінуць у парляманьце Лёкарнскія ўмовы, але і адазвалі з габінэту ўсіх 3 сваіх міністраў. Гэткім чынам цэнтра-правы ўрад Лютэра траціць апору ў парляманьце дый наагул перастае істнаваць. Канцлер павінен будзе падацца ў адстаўку, якую, як кажуць, прэзыдэнт прыме, але яму-ж дасьць даручэньне стварыць тымчасова „фаховы“ (непалітычны, непарляманцкі) ўрад. Газэты пішуць, быццам лявіца (і сацыял-дэмакраты) таксама адкіне Лёкарнскія ўмовы, але толькі дзеля таго, каб, зваліўшы габінэт, заапэляваць да апініі ўсяго краю, інакш кажучы, — скарыстаць з выпадку, каб назначыць новыя выбары.

Паводле апошніх вестак, узьнялася думка вырашыць справу прыняцьця Лёкарнскіх умоваў плебісцытам (усенародным галасаваньнем).

## Урадавы крызіс у Францыі.

У сувязі з вялізарным абурэньнем усяе Францыі з прычыны згоды міністра фінансаў Кайо на сплату доўгу Амэрыцы—урад падаўся ў адстаўку.

Прэзыдэнт даручыў утварыць новы ўрад таму-ж прэм‘еру Пэнлевэ, які і злажыў габінэт міністраў, але ўжо без Кайо. Фінансы Францыі ўзяў на сябе сам Пэнлевэ.

## Грознае палажэньне ў Сірыі.

„Matin“ перадае, што палажэньне ў Сірыі вельмі паважнае. Дамаск эвакуіраваны, друзы атрымалі перавагу.

Дамаск з 18—20 кастрычніка быў арэнаю вельмі паважных здарэньняў. Пад уплывам агітацыі й распаўсюджаваньня чутак, што падходзяць паўстаўшыя друзы, жыхары места разам з паўстанцамі напалі на францускіх салдат, якіх каля ста забілі.

Французы выслалі туды танкі й браніраваныя аўтамабілі; паўстанцы ўмацаваліся за барыкадамі. Тады французы пачалі абстрэл усяго места, не шкадуючы ні старых, ні малых...

Многія будынкі зруйнованы, на вуліцах валяюцца трупы. Каля 2.000 чал. згінула пад разваліўшыміся будынкамі.

Паўстанцы згуртаваліся каля Дамаску, й трэба спадзявацца новых боек.

З Ерузаліму пішуць, што арабскі выканаўчы камітэт зьвярнуўся з адозвай да ўсяго арабскага сьвету з заклікам аб матар‘яльнай дапамозе сірыйскаму жыхарству. Камітэт адначасна выражае пратэст проці гаспадараваньня Французаў у Сірыі.

## Францускія страты ў Марокко і Сірыі.

Пэнлевэ абвясьціў, што да 15./X. 1925 г. французы ў Марокко страцілі: 2176 забітых і 5306 раненых. Кошты вайны дайшлі да 950 мільёнаў франкаў.

У Сірыі—забітых 624, чал. грошай выдана 197 мільёнаў.

## Аружны напад Грэцыі на Баўгарыю.

Не пасьпеў закончыцца ў Лёкарно чарговы этап „пацыфікацыі Эўропы“, як у другім канцы тэй-жа быццам ужо „мірнай Эўропы“ ізноў выбухнуў чарговы ваенны пажар.

Мы ўжо пісалі, што „безработныя“ грэцкія манархісты нарэшце дарваліся да „працы“... — „Міравы“ Трактат, зроблены ў Вэрсалі, наперад прыгатаваў ім зусім адпаведную ахвяру—у асобе разброенай і абдзертай да ніткі суседняй Баўгарыі. Разброеная, акружаная з усіх бакоў старымі заклятымі ворагамі, згвалчаная тэрорам паразітнага ўраду Баўгарыя зусім ня мае сіл для абароны. І вось, сьвет стаўся сьведкай найагіднейшага абразу: 2 ці 3 дывізыі грэцкіх войскаў пяхоты і артылерыі, з усімі прыладамі сучаснай ваеннай тэхнікі, увайшлі сабе, як быццам гуляючы, на тэрыторыю Баўгарыі, занялі „фронт“ і пачалі біць насяленьне, рэзаць, страляць з гарматаў, паліць вёскі і месты „ворага“, якога няма,—бо баўгарскія вайсковыя часьці, якія былі на граніцы, адходзяць бяз бою перад непараўнана пераважаючым праціўнікам.

Баўгарыя толькі зьвярнулася да Лігі Народаў з мальбой аб абароне. Праўда, „вялікія“, што кіруюць Лігай, каб уратаваць яе ад аканчальнай кампрамітацыі, шпарка ўзяліся ратаваць Баўгарыю. Брыян экстрана склікаў у Парыж Раду Лігі, якая патрэбавала ад Грэцыі вываду войск з Баўгарыі.

Войскі то выйшлі, але пакінулі па сабе—поўную руіну, спаленыя вёскі і трупы пазабіваных жанок і дзяцей...

## Узнаўленьне хатняй вайны ў Кітаі.

У Кітаі, трэба думаць, разыгрываецца апошні акт вялікай барацьбы народу за вызваленьне — як з пад улады „сваіх“ чорных генаралаў, таксама і з нявол ў чужынцаў.

Цяпер рашучая барацьба ўзгарэлася між генералам Ву-Пэй-Фу, які стаіць на чале народнай вызваленчай арміі, падтрымліванай Радавым урадам, і—дыктатарам Манчжурыі Чан-Тсо-Лінам, які апіраецца на Японіі і Англіі. Манчжурскі дыктатар мае добра абучаную і прыладжаную армію, але на баку Ву-Пэй-Фу агромная большасьць правінцыяў (18 проці 4), і армія яго значна большая, ня кажучы ўжо аб ахопліваючым яе вызваленчым духу.

Дагэтуль народная армія ўсюды пабівае англа-японскіх наймітаў Чан-Тсо-Ліна. Каля Нанкіна ўзяты ў палон 7.000 жаўнераў мукдэнскай арміі. Вялікія месты: Шанхай, Сучаў, Вузіх, Чынкіян і Нанкін заняты арміяй Ву-Пэй-Фу.

Каб прыдаць сабе больш „аўтарытэту“, Чан-Тсо-Лін абвясьціў сябе імпэратарам усяго Кітаю. Радавая прэса слушна піша, што гэта, таксама як і падтрыманьне з боку Англіі, толькі прысьпешыць яго аканчальнае паражэньне.

Японія не на жарты зьлякалася магчымага паражэньня свайго найбліжэйшага „суседа“ і прыяцеля, якому яна зрабіла яго армію. Экстрэна была выслана ў Шанхай і Вэй-Хай-Вэй дадаткавая японская эскадра.

Што справа Чан-Тсо-Ліна—прапаўшая, найляпей сьведчаць ня толькі паражэньні, але і пачаўшыяся ўжо „здрады“ ў яго арміі і флёце—навет сярод вышэйшых каманадзіраў.

## Палажэньне ў Эгіпце.

Нацыяналісты ў Каіры вядуць моцную агітацыю проці Англіі. Адзін з лідэраў нацыяналістаў заявіў, што згоды паміж Эгіптам і Англіяй ня будзе датуль, пакуль апошні англійскі жаўнер ня выйдзе з Эгіпту.

У часе рэлігійных сьвятаў у Тантах дайшло да аружнай сутычкі. 54 чал. забіты, 43 цяжка ранены.

# ХРОНІКА.

**Суды над беларусамі.** 22/X у апэляцыйным судзе разглядалася справа грам. Сегэня Адольфа, якога акружны суд засудзіў на вечную катаргу за нібы „дзяржаўную здраду“ ў 1918 годзе, у Лідзкім пав., калі там ня было ніякое ўлады ані войска, ды ня былі ўстаноўлены падставы польскага падданства.

Баранілі яго адвакаты Міцкевіч, Нэйман, Чэрніхаў і Сьмароўскі (з Варшавы).

На судзе справа Сегэня была адложана, каб выклікаць 12 яго сьведкаў.

23/X у акружным судзе разглядалася справа 13 беларускіх вучняў і сэмінарыстаў, якім закідалі належнасьць да беларускай арганізацыі, што імкнулася да стварэньня Незалежнай Беларусі.

На суд зьявіліся толькі 5 нялетніх вучняў,—рэшта ўцякла ў Радавую Беларусь. Двох з падсудных: Арлянкевіча й Гардзея апраўдалі. Каралёнка, які прасядзеў 2 гады і паўтара месяца, засудзілі на 1 год крэпасьці з залічэньнем дасудовай адседкі; Нарушэвіча засудзілі на 1 год вастрогу, залічыўшы 5 месяцаў дасудовае адседкі; Чарняўскага—таксама на 1 год турмы, залічыўшы 7 месяцаў.

Бараніў іх адвакат Міцкевіч.

**Забарона.** Выдаваная ў Рызе беларуская газэта „Голас Беларуса“ ў значным ліку прыходзіла ў Заходнюю Беларусь, паведамляючы аб жыцьці беларусаў пад Латвіяй. Нядаўна польскі ўрад забараніў пошце дастаўляць сюды гэту газету.

**Другое выданьне Беларускага Адрыўнога Календара на 1926 г.** З прычыны таго, што камісар ураду на м. Вільню, п. Вімбор, сканфіскаваў толькі-што выпушчаны Беларускі Адрыўны Календар на 1926 г. за зьмяшчэньне ў ім адрыўкаў вершаў, **дапушчаных расейскай і нават польскай цэнзурай**, ды г. п.,—выдаўцы рыхтуюцца выпусьціць календар у другім выданьні, выкінуўшы „кра-

# З Палесься.

„Чы напысав ти уже до „Газеты Полиской“ кореспонденцыю з жиццявтвоих гмины, альбо вси? Що напышешь буде надроковане, чытаць то будуць сотни людей, которы познають през гэт жицце Полессія. Пышы иж, присылай кореспонденцыю“.

Гэтак рэдакцыя „Газэты Палескай“, („Gazeta Poleska“), выдаванай Пінскім павятовым соймікам, зварачаецца ў № 7 да сваіх чытачоў. Газэта друкуецца ў польскай мове, а сваею мэтай мела абслужваць жыхароў Палесься (Піншчыны). Дык выходзіла, што „нашым салам па нашай скуры....“, бо на Палесьсі палякоў (апроч абшарнікаў, асаднікаў ды "ўжэнднікаў“) трэба пашукаць і ў дзень з вагнём. І вось, рэдактар (з асаднікаў) зьмілаваўся—пачаў некаторыя рэчы ў сваёй газэце пісаць, як ён кажа, „папалеску“, а не пабеларуску, бо паляшукі „pochodzą od Derewlan, a Białorusini od Krywiczan“.

Але пакінем продкаў Палесься ў спакою, бо захочуць абазвацца і Дрыгвічы з Радзімічамі *), а паглядзімо, як піша і пэратлумачвае з польскага на „палескі“ гэта газэта.

### Цэрква праваслауна у Польщы.

Цэрква праваслауна колись **разделлася** на дві часкі, одна була од вікау подвладна патріарху Цареграда, а друга мытрополиту з Масквы.

Церква праваслауна у Польщы по смэрты кіяускага мытрополита Сыльвестра Коссова (р. 1657) попала под владу Масквы.

Нарады тепэрешных стасунков нэпрізнания віры христіянской Саветамі цэрква праваслауна у Польщы була у хлопотливом положении. У року 1922 сабор праваслауных архыреяу (Мэтраполита Егор, архырей Дэныс і Александэр) **ухвалыу** порваты стясункі з Масквою і запроводыты у Польщы аутокэфалию цэрквы праваслауной. Дня 13 лыстопада 1924 року патрыарх Цареградски Рыгор дау асобны урочысты „томос“ пысьмо прызнания самостійносьци церквы православной у Польщы, особліва дэлегация „Пханару“ мэтрополыты. Германз Сардес і Иаким з Халкедоніи і сэкретар Сабору Цареградскаво Констаитынидэс прівезлы до Варшавы пысьмо і далы мытрополыту Дэнису голові праваслауной цэрквы у Польщы.

На урочыстосьць оддання того пысма зіхалыся тож: архырей Виленскы і Лидскы Федос, архырей Полісся Алксандэр, гродэнскы і новагрудскы Алексій, архырей кременецкій Сымон, архырей Антон і архымандрыта игумен Почаеускай Лауры.

### Кредыты на мелорацию.

В выду потребы поправення нашых варштатов господарчых и увеличення силы господарования и для усиления продукции рослиносці, Урад провев через сейм и сенат уставу з дня 22 липца 1925 року о панствовами фундушу кредыту на мелорацію рольнию (Дз. Уст. № 88 поз. 609).

**В цели выконания** гэтай уставы оглошены два роспоряженя и адно абвещание, которое всказуе варунки, на яких Панствовы Банк Рольны будэ даваты пожычки меліоротывны з гэтого фундушу.

Пользоватыся пожичками могуть увси, которы корыстающь з роли и могуць даты повную гарантыю выплаты, першенство еднако маюць до отрымания пожычок спулки водяныи, а засим по колейци могуць отбырать пожычки гмины, мешканьцы весок громадамы и на решты инны, але и для тих першенство буде даватысь дробным господарям рольним, хуторов, альбо тым що маюць идты на хуторы, огискам культуры рольный, школам и т. п.

Пожычки опроцентованы по 5 оц ста на рок, могуць быць даваны на дренование орошение осушание грунтов и на мелорацию торфовиск, на час од 6 до 9 годов, и в тых обоснованных выпадках час на яки даецца пожычка можа протянутыся до 12 годов.

Подания о выданию позычок з Панствоваго фундушу кредыту на мелиорацию рольне налэжы складаты Панствовому Банку Рольниму.

Справой гэтого повинна заинтэресоватыся наши гмины и спульнельни рольничо-гандловых.

Хіба кожнаму граматнаму ня трэба пералічваць, колькі тут ёсьць абмылак. Без кароткага у (якое пішацца ў) ніяк не магчыма абыйсьціся ў пісьме пабеларуску, ці „пополески“. А колькі тут „палескіх выразаў“ з маскоўскага на Варшаўскі, ці, наадварот, з Варшаўскага на Маскоўскі лад, як „разделялася“ (маскоўск.) „ухвалау“ (польскі) „В цели выконания“ (польскі выраз на маскоўскі лад) і шмат іншых.

Або яшчэ на 6 стр.: „Справой гэтого повінна заинтэресоватыся наши гмины и спульдельни рольничо-гандловых“,—„вось прыклад, як ня трэба пісаць“, напэўна сказаў-бы так сваім вучаніцам рэдактар Раман Гарашкевіч (бо ён-жа ёсьць і вучыцелем у прыватнай гімназіі ў Пінску).

Але, адкінуўшы граматыку з сінтаксісам, пане рэдактар з настаўнікаў (ці можа наадварот, ня ведаю добра), трэба прызнацца, што ўсе беларусы, ці паходзяць яны з крывічоў, ці дрыгвічоў, гавораць аднэю моваю беларускаю, і тое, што ў некаторых вёсках на Палесьсі можна пачуць „шчо“ (а ня „што“), „будэ“ (а ня „будзе“), як уплыў украінскай мовы, хіба не стаіць на перашкодзе, каб пісаць **граматна** пабеларуску, ці — як пан кажа— „паполеску“. Заклікаю, пішэце як найбольш „папалеску“ і далей, але толькі заглянеце ў беларускі правапіс.

**Пінчук.**

*) З легкае рукі п. Ластоўскага, які, сядзючы у Коўне, займаецца перахрышчываньнем беларусаў на крывічоў!—*Рэд.*

